ДЭПАРТАМЕНТ ПА АРХІВАХ І СПРАВАВОДСТВУ
МІНІСТЭРСТВА ЮСТЫЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ АРХІЎ БЕЛАРУСІ

# Гербоўнік беларускай шляхты

ТОМ 3

Мінск
«Беларусь»
2014

УДК 929.5/.6(476)
ББК 63.2(4Беи)
Г37

Рэкамендавана да друку Вучоным саветам
Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі

*Выпуск выдання ажыццёўлены па заказу і пры фінансавай падтрымцы
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь*

Аўтарскі калектыў: Дз. Ч. Матвейчык (кіраўнік), І. Л. Вернер,
А. М. Латушкін, Дз. В. Лісейчыкаў,
С. А. Рыбчонак

Рэдкалегія: У. І. Адамушка, Дз. В. Лісейчыкаў,
А. Я. Рыбакоў, Дз. У. Яцэвіч (старшыня)
Рэцэнзенты: кандыдат гістарычных навук В. С. Макарэвіч,
кандыдат гістарычных навук У. П. Крук

Навуковы рэдактар: прафесар, доктар габілітаваны А. Рахуба

**Гербоўнік беларускай шляхты. Т. 3. В.** / Дз. Матвейчык [і інш.];
Г37 навук. рэд. А. Рахуба. — Мінск: 2014. — 663 с.
ISBN 978-985-01-1095-4.

Нацыянальным гістарычным архівам Беларусі працягваецца шматтомнае выданне, распачатае ў 2002 г. У трэцім томе «Гербоўніка беларускай шляхты» пададзена 249 радаводаў шляхты пераважна Мінскай губерні на літару «В», складзеных на падставе матэрыялаў фонду Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу.

Прызначаецца для шырокага кола чытачоў — як прафесійных даследчыкаў, так і аматараў айчыннай гісторыі і генеалогіі.

**УДК 929.5/.6(476)**
**ББК 63.2(4Беи)**

**ISBN 978-985-**

© Дзяржаўная ўстанова
«Нацыянальны гістарычны
архіў Беларусі», 2014
© Выдавецтва «Беларусь», 2014

# ПРАДМОВА

У 2007 г. Нацыянальным гістарычным архівам Беларусі быў выпушчаны другі том «Гербоўніка беларускай шляхты», які ахопліваў радаводныя росписы шляхты пераважна Мінскай губерні, чые прозвішчы пачыналіся на літару «Б». З таго часу айчынная гістарыяграфія зрабіла немалы крок наперад у даследаванні гісторыі шляхецкага саслоўя на беларускіх землях і яго ролі ў палітычных, эканамічных, сацыяльных і нацыятворчых працэсах. Беларускімі гісторыкамі ў гэты перыяд вяліся даследаванні ў самых розных накірунках — удзел шляхты ў палітычным жыцці Вялікага Княства Літоўскага, Рэчы Паспалітай і Расійскай імперыі (В. Галубовіч, А. Дземідовіч, С. Занеўскі, П. Лойка, А. Лукашэвіч, А. Мацук, У. Падалінскі, А. Радаман, В. Цыганец, Р. Юргайціс, М. Шымукенус[1]), штодзённае, побытавае і сямейнае

---

[1] Галубовіч В. У. Інструкцыя полацкай шляхты на элекцыйны сойм 1632 г. // Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі: матэрыялы V Міжнарод. навук. канф. (24–25 кастр. 2007 г.) / уклад. Т. А. Джумантаева. — Полацк: НПГКМЗ, 2009. — С. 59–64; Яго ж. Палякі і карона польская ў пасольскіх інструкцыях шляхты Вялікага Княства Літоўскага ў час праўлення Уладзіслава Вазы // Шлях да ўзаемнасці: [польска-беларускія моўныя, літаратурныя, гістарычныя і культурныя сувязі]: матэрыялы XV Міжнар. навук. канф. (Гродна, 13–14 лістап. 2008 г.) / рэдкал.: І. Крэнь (адк. рэд.) і інш. — Гродна: ГрДУ, 2009. — С. 199–202; Дземідовіч А. В. Стаўленне шляхты Вялікага Княства Літоўскага да ўзаемастасункаў дзвюх частак Рэчы Паспалітай у апошняй трэці XVI – першай трэці XVII ст. // Актуальныя праблемы станаўлення і развіцця беларускай дзяржаўнасці: да 90-годдзя ўтварэння БССР: матэрыялы Рэсп. навук.-тэарэт. канф. (Мінск, 27 лют. 2009 г.): У 2 ч. / рэдкал.: А. І. Андарала і інш. — Мінск: БДПУ, 2009. — С. 53–56; Заневский С. Падение Речи Посполитой и роль шляхты в этом процессе в изображении краковской исторической школы // Гісторыя: праблемы выкладання. — 2011. — № 5. — С. 58–62; Лойка П. А. Пазіцыя шляхты беларускіх зямель Рэчы Паспалітай у царкоўна-рэлігійных канфліктах апошняй трэці XVI — першай трэці XVII ст. // Научные труды Республиканского института высшей школы. — Вып. 10, ч. 1. — Мінск, 2010. — С. 101–106; Яго ж. Пазіцыя шляхты беларускіх зямель у знешнепалітычных стасунках Вялікага Княства Літоўскага ў апошняй трэці XVI — першай трэці XVII ст. // Беларускае мастацтва: гісторыя і сучаснасць: зборнік матэрыялаў Рэсп. навук.-твор. канф. (19 сакав. 2009 г.): У 2 т. / III Няфёдаўскія чытанні. — Т. 2. — Мінск : БДАМ, 2009. — С. 11–17; Лукашевич А. М. Мелкопоместная шляхта Беларуси в стратегических планах военного ведомства России в начале XIX в. // Актуальныя праблемы сацыяльнай гісторыі Беларусі (канец XVIII — пачатак XX ст.): матэрыялы Рэсп. навук.-тэарэт. канф. (Мінск, 23 лют. 2007 г.): да 90-годдзя Лютаўскай рэвалюцыі / Беларус. дзярж. пед. ун-т; рэдкал.: А. І. Андарала [і інш.]. — Мінск, 2007. — С. 8–12; Мацук А. У. Адносіны магнатаў і шляхты да выбараў полацкага ваяводы за панаванне Аўгуста III // Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі: матэрыялы V Міжнар. навук. канф. (Полацк, 24–25 кастр. 2007 г.) /

жыццё шляхты (А. Барсук, І. Вуглік, М. Грудзінава, М. Красноў, В. Папко, А. Скеп'ян, Н. Сліж[2]), сацыяльнае і матэрыяльнае становішча шляхты і яе

уклад. Т. А. Джумантаева. — Полацк: НПГКМЗ, 2009. — С. 120–128; Яго ж. Аршанская павятовая эліта ў часы панавання Аўгуста III // Вестник Полоцкого государственного университета. — 2010. — № 7. — С. 21–30; Яго ж. Асаблівасці выбараў павятовых земскіх ураднікаў у панаванне Аўгуста III (на прыкладзе дакументаў аб выбары мазырскіх земскіх ураднікаў // Беларускі археаграфічны штогоднік. — Вып. 11. — Мінск, 2010. — С. 214–225; Яго ж. Пазіцыя магнатаў і шляхты ВКЛ у пачатку бескаралеўя 1733 г. // Беларускі гістарычны часопіс. — 2011. — № 7. — С. 3–10; Падалінскі У. А. Павятовая палітычная эліта ў святле дзейнасці гарадзенскага сойміка ў другой палове XVI ст. // Гарадзенскі палімпсест. 2009. Дзяржаўныя ўстановы і палітычнае жыццё, XV–XX стст.: зборнік матэрыялаў II Міжнар. навук. канф. (Гродна, лістап. 2009 г.) / пад рэд. А. Ф. Смаленчука, Н. У. Сліж. — Гародня, 2009. — С. 179–199; Яго ж. Шляхта Вялікага Княства Літоўскага ў дыпламатычных місіях Рэчы Паспалітай (апошняя трэць XVI ст.) // Stusia Historica Europæ Orientalis: научный сборник / Государственное учреждение образования "Республиканский институт высшей школы", Кафедра историко-культурного наследия Беларуси. — Вып. 3. — Минск: Издательский центр БГУ, 2010. — С. 188–208; Радаман А. А. Вайсковыя шляхецкія з'езды (попісы і зборы паспалітага рушэння) Наваградскага павета ў другой палове XVI ст. // Парламенцкія структуры ўлады ў сістэме дзяржаўнага кіравання Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай у XV–XVIII стагоддзях: матэрыялы Міжнар. навук. канф. (Мінск — Наваградак, 23–24 лістап. 2007 г.). — Мінск: БІП-С Плюс, 2008. — С. 220–231; Цыганец В. Удзел лідскай шляхты ў паўстанні 1863–1864 гг. // Шлях да ўзаемнасці = Droga ku wzajemności: матэрыялы XV Міжнар. навук. канф. (Гродна, 13–14 лістап. 2008 г.) / рэдкал.: С. Мусіенка, І. Папоў, Я. Роўба [і інш.]. — Гродна: ГрДУ, 2009. — С. 234–240; Юргайтис Р. Как голосовала шляхта на сеймике Речицкого повета 7 февраля 1706 г., выбирая депутатов Главного Литовского трибунала // Парламенцкія структуры ўлады ў сістэме дзяржаўнага кіравання Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай у XV–XVIII стст.: матэрыялы Міжнар. навук. канф. (Мінск–Наваградак, 23–24 лістап. 2007 г.). — Мінск: БІП-С Плюс, 2008. — С. 285–295; Шимукенус М. В. Могилевская шляхта в период 1812 года // Могилевский поисковый вестник. — Вып. 7. — Могилев: Могилевская областная укрупненная типография им. Спиридона Соболя, 2012. — С. 12–20; і інш.

[2] Барсук А. Я. Маёнткі мазырскай шляхты // Міжнародныя Шамякінскія чытанні "Пісьменнік — Асоба — Час": Матэрыялы II Міжнар. навук.-практ. канф. (Мазыр, 20–21 кастр. 2011 г.). — Мазыр, 2011. — С. 113–117; Вуглік І. Р. Гаспадарчы комплекс шляхецкай сядзібы XVII–XVIII стст. // Весці Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка. Сер. 2. Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Культуралогія. — 2011. — № 2. — С. 38–41; Яго ж. Застольны этыкет старабеларускай шляхты XVII–XVIII стст.: тыпалогія, гістарычныя змены // Веснік Брэсцкага ўніверсітэта. Сер. 2. Гісторыя. Эканоміка. Права. — 2010. — № 2. — С. 22–26; Грудзінава М. Шляхецкі двор як свет забытай прыгажосці ва ўспамінах Я. Булгака // Працы кафедры гісторыі беларускай літаратуры Белдзярж-

ўзаемаадносіны з іншымі саслоўямі (А. Дамарад, К. Ерзікава, Л. Казакоў, Л. Клімуць, П. Лойка, В. Макарэвіч, С. Стрэнкоўскі, І. Увараў, А. Шаланда[3]),

---

універсітэта. — 2009. — Вып. 10. — С. 140–148; Красноў М. І. Побытавая культура шляхты беларускіх зямель ВКЛ як фактар фармавання вонкавага аблічча // Вестник МГИРО. — 2011. — № 2. — С. 23–27; Папко В. М. Свецкае жыццё Заходняй Беларусі 1910–1930-х гг. па ўспамінах жанчын-шляхцянак // Культура правядзення вольнага часу моладзі: праблемы і перспектывы: зборнік навуковых прац: У 2 т. — Т. 1. — Брэст: Альтернатива, 2010. — С. 22–28; Скеп'ян А. А. Касцюміраваныя забавы ў ВКЛ у XVI–XVII стст. // Беларускі гістарычны часопіс. — 2012. — № 6. — С. 25–32; Сліж Н. У. Афармленне інстытута шляхецкай сям'і ў Вялікім Княстве Літоўскім // Silva rerum nova: штудыі ў гонар 70–годдзя Г. Я. Галенчанкі / уклад. А. Дзярновіч, А. Семянчук. — Вільня: Aidai, Мінск: Athenæum, 2009. — С. 264–278; Яе ж. Практыка разводаў у Вялікім Княстве Літоўскім у 16–18 стст. // Гістарычны альманах. — 2009. — Т. 15. — С. 14–34; і інш.

[3] Дамарад А. А. Зямельныя адносіны паміж шляхтай і дзяржавай у Вялікім Княстве Літоўскім у XIII–XVI стст. // Труды Белорусского государственного технологического университета. Сер. 5. Политология, философия, история, филология. — 2009. — Вып. 17. — С. 118–121; Яго ж. Эвалюцыя правоў шляхты як фактар станаўлення беларускай дзяржаўнасці (канец XIV – пачатак XVI ст.) // Актуальныя праблемы станаўлення і развіцця беларускай дзяржаўнасці: да 90-годдзя ўтварэння БССР: матэрыялы Рэсп. навук.-тэарэт. канф. (Мінск, 27 лют. 2009 г.): У 2 ч. / рэдкал.: А. І. Андарала і інш. — Мінск: БДПУ, 2009. — С. 22–25; Яго ж. Эвалюцыя правоў шляхты Вялікага Княства Літоўскага ў XVI ст. // Труды Белорусского государственного технологического университета. Сер. 5. История, философия, филология. — Минск: БГТУ, 2010. — Вып. 18. — С. 28–32; Ерзікава К. Ю. Вайсковыя падаткі і павіннасці дробнай шляхты Вялікага Княства Літоўскага ў XVI–XVII стст. // Труды молодых специалистов Полоцкого государственного университета / Учредитель: Учреждение образования "Полоц. гос. ун-т". — Вып. 41. — Новополоцк: ПГУ, 2010. — С. 56–58; Казакоў Л. Ю. Узнікненне і развіццё фальваркаў у шляхецкіх уладаннях у Вялікім Княстве Літоўскім (другая палова XVI–першая палова XVII ст.) // Беларускі гістарычны часопіс. — 2011. — № 4. — С. 22–30; Клімуць Л. Я. Узаемаадносіны магнатаў і шляхты ў палітычнай сістэме Рэчы Паспалітай // Романовские чтения–7: сборник статей Междунар. науч. конф. (Могилев, 26 нояб. 2010 г.) / редкол: А. А. Воробьев (председатель) и др. — Могилев: МГУ, 2011. — С. 124–125; Лойка П. А. Афармленне шляхецкага саслоўя ў Вялікім Княстве Літоўскім // Працы гістарычнага факультэта БДУ: навуковы зборнік. — 2010. — Вып. 5. — С. 102–115; Яго ж. Узаемадачыненні шляхецкага і мяшчанскага саслоўяў на беларускіх землях у другой палове XVI — першай палове XVII ст. // Веснік БДУ. Сер. 3. Гісторыя. Філасофія. Псіхалогія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Права. — 2009. — № 3. — С. 3–8; Яго ж. Шляхецка-сялянскія міжсаслоўныя адносіны на беларускіх землях у другой палове XVI – першай палове XVII ст. // Российские и славянские исследования: сборник научных статей. — 2009. — Вып. 4. — С. 67–74; Макарэвіч В. С. Дробная шляхта ў структуры сельскага насельніцтва Мінскай губерні ў 70-я гг. XIX ст. // Веснік Беларускага

мова і самасвядомасць беларускай шляхты (А. Дзярновіч, Ю. Казакоў, В. Макарэвіч[4]), узаемаадносіны шляхты з уладамі Расійскай імперыі і т.зв. «разбор» шляхты (А. Дамарад, В. Макарэвіч, С. Рыбчонак, Г. Туміловіч[5]), высылкі шляхты з Беларусі ў Сібір (В. Гарбачова, Г. Крых і С. Токць, В. Пі-

дзяржаўнага ўніверсітэта. Сер. 3. Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Права. — 2007. — № 1. — С. 20–25; Стрэнкоўскі С. П. Кантроль шляхецкай дзяржавы над гарадскім самакіраваннем у другой палове XVIII ст. // Вестник Полесского государственного университета. Сер. общественных и гуманитарных наук. — 2011. — № 2. — С. 13–18; Уваров И. Ю. Сословное обособление представителей военно-служилого сословия Великого Княжества Литовского в XIV – начале XVI в. // Веснік Брэсцкага ўніверсітэта. Сер. 2. Гісторыя. Эканоміка. Права. — 2011. — № 2. — С. 41–46; Шаланда А. І. Гербавая паланізацыя шляхты Гарадзенскага павета ВКЛ у другой палове XVI – першай палове XVII ст. // Архіварыус: зб. навук.-папул. паведамл. і арт. — 2010. — Вып. 8. — С. 250–255; і інш.

[4] Дзярновіч А. І. Узроўні ідэнтычнасці шляхты Вялікага Княства Літоўскага ў XVI–XVIII стст. // Druvis: альманах цэнтра этнакасмалогіі “KRYŬJA”, 2008. — № 2. — С. 169–180; Казаков Ю. Л. Самоидентификация шляхетского сословия в ВКЛ в конце XV – начале XVII в. // Працы гістарычнага факультэта БДУ: навуковы зборнік. — Вып. 4. — Мінск, 2009. — С. 13–20; Макарэвіч В. Мова шляхты Беларусі ў XIX ст. // Беларускі гістарычны часопіс. — 2012. — № 3. — С. 11–17; Яго ж. Эвалюцыя форм нацыянальнай ідэнтычнасці шляхты Беларусі ў XVI–XIX стст. // Беларускі гістарычны часопіс. — 2007. — № 1. — С. 30–35.

[5] Дамарад А. А. Аб пацвярджэнні дваранства шляхтай Віленскай і Гродзенскай губерняў (па матэрыялах Літоўскага дзяржаўнага гістарычнага архіва) // Гісторыя: праблемы выкладання. — 2007. — № 4. — С. 45–52; Макаревич В. «Антиразбор» шляхты: подделка дворянских документов в Беларуси в XIX веке // Деды: дайджест публикаций о белорусской истории / сост. А. Е. Тарас. — Минск: Харвест, 2010. — С. 26–39; Макарэвіч В. “Панскі разбор шляхты”: абеззямельванне чыншавікоў у другой палове XIX ст. і чыншавая рэформа 1886 г. у Беларусі // Беларускі гістарычны часопіс. — 2001. — № 4 (141). — С. 3–14; Яго ж. Трансфармацыя сацыяльнай структуры дваранства Беларусі ў канцы XVIII–XIX ст. // Працы гістарычнага факультэта БДУ: навуковы зборнік. — Вып. 4. — Мінск, 2009.– С. 33–40; Рыбчонак С. А. Праблема верагоднасці вывадаў шляхецтва ў першай палове XIX ст. (па матэрыялах Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу) // Праблемы гістарыяграфіі, крыніцазнаўства, архівазнаўства і археаграфіі ў Беларусі: матэрыялы «круглага стала», прысвеч. 60-годдзю з дня нараджэння праф. У. М. Міхнюка (Мінск, 28 верас. 2007 г.): навук. рэд.: У. І. Адамушка, А. Я. Рыбакоў. — Мінск, 2008. — С. 95–109; Туміловіч Г. Расійскі царызм і шляхта Беларусі (1795–1863): Праверка на “высакароднасць” // Беларускі гістарычны агляд. — Т. 17. — Мінск, 2010. — С. 125–154; і інш.

чугіна-Мобек, А. Радзюк[6]), гісторыя і генеалогія асобных шляхецкіх родаў (В. і М. Анісавец, М. Быхаўцаў, А. Залівака, С. Лаўроў, В. Папко, А. Статкевіч-Чабаганаў, С. Суднік, В. Урублеўскі, Я. Чарнецкі[7] і інш.) і шматлікія

---

[6] Горбачева О. В. Ссыльные 1863–1864 гг. // Архіварыус: зб. навук. паведамл. і арт. — Вып. 5. — Мінск: НГАБ, 2007. — С. 85–114; Крых Г., Токць С. Гісторыя пасялення Мінск-Дваранскае: засцянковая шляхта з Беларусі ў сібірскім Прыіртышшы // Беларускі гістарычны часопіс. — 2012. — № 3. — С. 4–10; Пичугина-Мобек В. В. Ссыльные участники восстания 1863 г. в Поволжье и Приуралье // Архіварыус: Зб. навук.-папул. паведамл. і арт. — Вып. 8. — Мінск: НГАБ, 2010. — С. 164–177; Радзюк А. Зьнішчэнне шляхецкіх ваколіцаў на Гарадзеншчыне ў 1863–1864 гг. // ARCHE. — 2010. — № 12. — С. 151–173; і інш.

[7] Анісавец В., Анісавец М. Юдзіцкія —ураднікі рэчыцкія, "графы лоеўскія" // Беларускі гістарычны часопіс. — 2011. — № 2. — С. 49–56; Быхаўцаў М. Генеалогія роду Алендскіх мачулінскай лініі // Ваўкавышчына: краязнаўчы часопіс. — 2007. — № 5. — С. 30–33; Заливако А. С. История рода Мурашко: посвящается памяти предков Мурашко в назидание потомкам. — Минск: Энциклопедикс, 2011. — 135, [1] с., [6] л.; Корнилович Э. Святополк-Мирские. Хранители чести. — Минск: ФУАинформ, 2012. — 104 с.; Лавров С. Роль рода Воловичей в организации местного самоуправления Гродненского повета // Шлях да ўзаемнасці = Droga ku wzajemności: матэрыялы XV Міжнар. навук. канф. (Гродна, 13–14 лістап. 2008 г.) / рэдкал. С. Мусіенка, І. Папоў, Я. Роўба [і інш.]. — Гродна: ГрДУ, 2009. — С. 167–170; Папко В. М. Маёнтак Магілёўцы памешчыкаў Дзяконскіх у 1880–1930-я гады // Вестник Полоцкого государственного университета. — 2010. — № 1. — С. 66–72; Яе ж. Пятровіцкая галіна роду Дзяконскіх і іх маёнткі на Брэстчыне ў XIX–XX стст. // Беларускі гістарычны часопіс. — 2009. — № 9. — С. 30–37; Яе ж. Род Быхаўцаў герба "Магіла" на Брэстчыне // Вестник Брестского государственного технического университета. — 2010. — № 6. — С. 51–56; Яе ж. Род Дзяконскіх і іх маёнткі на Брэстчыне ў XIX–XX стст. — Брэст: Альтернатива, 2009. — 232 с. (выд. 2 — Брэст, 2011); Яе ж. Род Талочкаў гербу "Побуг" // Ваўкавышчына: краязнаўчы часопіс. — 2011. — № 2. — С. 23–30; Яе ж. Род Тарасовічаў у Ваўкавыскім павеце Гродзенскай губерні ў XIX–XX стст. // Ваўкавышчына: краязнаўчы часопіс. — 2011. — № 2. — С. 15–22; Плавинский А. С. 500 лет роду Плавинских. — Минск: Конфидо, 2012. — 176 с.; Статкевіч-Чабаганаў А. В. Геталты і Тышкевічы з роду Каленікавічаў герба "Ляліва": пераклад з рускай мовы // Роднае слова. — 2011. — № 7. — С. 81–84; Яго ж. Глінскія і Глінскія-Ліхадзіеўскія гербаў "Глінскія" і "Ястрабец": пераклад з рускай мовы // Роднае слова. — 2011. — № 8. — С. 85–89; Яго ж. Іваноўскія герба "Рагаля": пераклад з рускай мовы // Роднае слова. — 2012. — № 1. — С. 84–85; і інш.; Яго ж. Я — сын Ваш: Статкевічы, Сацкевічы-Статкевічы герба "Касцеша": Карафа-Корбуты герба "Корчак". — Мінск: Роднае слова, 2011. — 589, [1] с. — (Летапіс беларускай шляхты. Страла выратавання); Суднік С. Макрэцкія Лідскія // Лідскі летапісец. — 2010. — № 3 (51). — С. 22–40; Урублеўскі В. Род дваранаў Гартынгаў на Беларусі // Архіварыус: зб. навук. паведамл. і арт. — Вып. 7. — Мінск: БелНДІДАС, 2009. — С. 258–266; Чарнецкі Я.

іншыя, ужо не гаворачы пра даследаванні жыцця і дзейнасці асобных прадстаўнікоў шляхецкага саслоўя розных перыядаў, якія вымяраюцца сотнямі. У гэты ж час былі апублікаваны альбо апісаны дакументы, якія звязаны з адным ці другім родам ці датычацца гісторыі шляхты ўвогуле[8], выдадзены некалькі гербоўнікаў беларускай шляхты, што паходзіла з пэўнай тэрыторыі (А. Шаланда, З. Яцкевіч[9]), спісаў і біяграфічных даведнікаў шляхты (Я. Анішчанка, В. Урублеўскі, Ф. Чарняўскі[10]), а таксама зроблены пэўныя

---

Паўлоўскія герба «Ляліва» з Навагрудскага ваяводства // Архіварыус: зб. навук. паведамл. і арт. — Вып. 8. — Мінск: НГАБ, 2010. — С. 243–250; і інш.

[8] Анішчанка Я. К. Абывацелі правінцыі: інструкцыі шляхецкіх сеймікаў беларускіх зямель ВКЛ (Літоўскай правінцыі) канца XVIII ст.: зборнік дакументаў. — Мінск: В. Хурсік, 2009. — 531 с.; Гайдук Г. В. Документы рода Цяпинских // Архіварыус: зб. навук. паведамл. і арт. — Вып. 8. — Мінск: НГАБ, 2010. — С. 235–242; Макарэвіч В. С. Ведамасці і спісы дваран 1850–1860-х гадоў як крыніца па гісторыі дробнай шляхты Беларусі (па матэрыялах фондаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі ў Мінску і Літоўскага дзяржаўнага гістарычнага архіва ў Вільнюсе) // Архівы і справаводства. — 2008. — № 1. — С. 117–122; Папко В. М. Крыніцы па гісторыі роду Радзівілаў у архіве і бібліятэках Познані // Архіварыус. — Вып. 7. — Мінск, 2009. — С. 125–132; Радаман А. А. Інструкцыя шляхты Гарадзенскага павета паслам на Варшаўскі сойм 1572 г. з агульнаваяводскага сойміка Трокскага ваяводства, які адбыўся ў Самілішках 9 снежня 1571 г. // Гарадзенскі палімпсест. 2009. Дзяржаўныя ўстановы і палітычнае жыццё, XV–XX стст.: зборнік матэрыялаў II Міжнар. навук. канф. (Гродна, лістап. 2009 г.) / пад рэд. А. Ф. Смаленчука, Н. У. Сліж. — Гародня, 2009. — С. 246–252; Рыбчонок С. А. Комплексы основных генеалогических источников в Национальном историческом архиве Беларуси // Архівы і справаводства. — 2007. — № 5. — С. 88–95; і інш.

[9] Шаланда А. Сапраўдны гербоўнік шляхты Ваўкавыскага павета ў XVI–XVIII стст. // Ваўкавышчына: краязнаўчы часопіс. — 2007. — № 1. — С. 14–29; № 3. — С. 1–6; № 4. — С. 1–7; № 5. — С. 1–9; Яцкевіч З. Л. Малы гербоўнік Рагачоўскай шляхты // Архіварыус: зб. навук. паведамл. і арт. — Вып. 6. — Мінск: БелНДІДАС, 2008. — С. 250–261; Вып. 7. — Мінск: БелНДІДАС, 2009. — С. 267–281; Вып. 8. — Мінск: НГАБ, 2010. — С. 255–276; і інш.

[10] Анішчанка Я. К. Спісы шляхты Магілёўскай губерні за 1783–1784 гг. // Архіварыус: зб. навук. паведамл. і арт. — Вып. 6. — Мінск, 2008. — С. 110-131; Вып. 7. — Мінск, 2009. – С. 75–99; Яго ж.Ураднікі беларускіх зямель ВКЛ у першай палове XVIII ст.: спісы на рускай мове. — Мінск, 2010. — 388, [2] с.; Яго ж. Урaднікі беларускіх зямель ВКЛ пры Станіславе Панятоўскім: спісы на рускай мове. — Мінск, 2008. — 530 с.; Яго ж. Урaднікі беларускіх зямель Расійскай імперыі на рубяжы XVIII–XIX стст.: спісы на рускай мове. — Мінск, 2011. — 391 с.; Яго ж. Шляхта Брестского воеводства: Список XVIII ст. — Минск, 2011. — 236 с.; Яго ж. Шляхта Волковысского повета: Список XVIII ст. — Минск, 2012. — 256 с.; Залівака А. С. Фасцыкул І.

падсумаванні даследаванняў у дадзеным накірунку (П. Лойка, У. Сосна, І. Увараў[11]). Пра цікавасць беларускіх гісторыкаў да даследаванняў шляхецкага саслоўя сведчаць таксама некалькі кандыдацкіх дысертацый, абароненых за апошняе пяцігоддзе (А. Дамарад, С. Занеўскі, В. Макарэвіч, С. Рыбчонак[12]).

Гэты, хоць і вельмі павярхоўны, агляд гістарыяграфіі паказвае, якое значнае месца займае шляхта ў навуковых распрацоўках айчынных гісторыкаў. Гэта ў сваю чаргу робіць яшчэ больш актуальным і неабходным

---

Радаводы шляхецкіх сем'яў ВКЛ на літару "В": артыкулы. — Мінск: Энциклопедикс, 2011. — 123 с.; Яго ж. Шляхта Магілёўскай губерні. Спісы. Фасцыкул ІІ. — Мінск: Энцыклапедыкс, 2012. — 80 с.; Урублеўскі В. В. Архівісты Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу // Архіварыус: зб. навук. паведамл. і арт. — Вып. 8. — Мінск: НГАБ, 2010. — С. 289–294; Вып. 9. — С. 234–243; Чарняўскі Ф. В.Ураднікі Менскага ваяводства XVI–XVIII стагоддзяў: біяграфічны даведнік. — Вып. 1. — Баранавічы: БелАніГал, 2007. — 256 с.; Яго ж. Ураднікі Менскага ваяводства XVI–XVIII стст.: біяграфічны даведнік. — Вып. 2 (скарбнікі, стражнікі). — Мінск: З. Колас, 2012. — 541 с.; Яго ж. Ураднікі (пасады, тытулы) Менскага ваяводства XVI–XVIII стагоддзяў: біяграфічны даведнік. Вып. 3 (канюшыя, абозныя, крайчыя, мастаўнічыя і будаўнічыя). — Баранавічы: БелАніГал, 2010. — 287 с.; і інш.

[11] Лойка П. А. Гістарыяграфія праблемы вывучэння ролі шляхты ў грамадска-палітычным жыцці Рэчы Паспалітай (другая палова XVI – першая трэць XVII ст.) // Працы гістарычнага факультэта БДУ: навуковы зборнік. — Вып. 3. — Мінск, 2008. — С. 46–52; Сосна У. А. Беларускія сяляне і шляхта ў даследаваннях Паўла Лойкі // Studia Historica Europæ Orientalis: научный сборник / Гос. учреж. образов. "Республиканский институт высшей школы", кафедра историко-культурного наследия Беларуси. — Вып. 3. — Минск: Издательский центр БГУ, 2010. — С. 315–324; Уваров И. Ю. Проблемы исследования историографии шляхты и сословно-представительных органов власти в период становления и развития Великого Княжества Литовского до Люблинской унии 1569 года // Вестник Полоцкого государственного университета. — 2010. — № 7. — С. 31–34; і інш.

[12] Гл.: Дамарад А. А. Інтэграцыя шляхты беларускіх зямель у склад дваранства Расійскай імперыі / аўтарэф. дыс. на атрыманне вучонай ступені канд. гіст. навук па спец. 07.00.02. — Мінск, 2007. — 19 с.; Заневский С. В. Вхождение шляхетского сословия белорусско-украинских земель в состав российского дворянства: источниковедение и историография проблемы (вторая половина XIX – начало XX в.) / дис. на соискание ученой степени канд. ист. наук по спец. 07.00.09. — Гродно, 2011. — 166, [2] л.; Макарэвіч В. С. Дробная шляхта Беларусі ў 30–60-я гг. XIX ст.: склад і эвалюцыя сацыяльна-прававога становішча / дыс. на атрыманне вучонай ступені канд. гіст. навук па спец. 07.00.02. — Мінск, 2008. — 158 с.; Рыбчонак С. А. Крыніцы масавага паходжання па генеалогіі Беларусі сярэдзіны XVII — пачатку XX ст. (па матэрыялах Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі) / аўтарэф. дыс. на атрыманне вучонай ступені канд. гіст. навук па спец. 07.00.09. — Мінск, 2010. — 25 с.; і інш.

такое зборнае выданне як «Гербоўнік беларускай шляхты», якое, з аднаго боку, падае вялікі масіў фактычных звестак пра значную колькасць (да некалькіх соцень на том) шляхецкіх родаў, а з другога — уводзіць у навуковы ўжытак каштоўныя, у пэўным сэнсе нават унікальныя, гістарычныя крыніцы[13].

* * *

Адной з найбольш складаных праблем пры падрыхтоўцы артыкулаў з'яўляецца выяўленне сфальсіфікаваных дакументаў, уключаных у справы аб дваранскім паходжанні шляхецкіх родаў. Як ужо адзначалася ў папярэдніх тамах «Гербоўніка»[14], у Мінскім ДДС у справах апынулася вялікая колькасць фальшывых дакументаў. І хаця наяўнасць фальшывак была характэрнай для ўсіх дваранскіх дэпутацкіх сходаў на тэрыторыі Беларусі, далучанай да Расійскай імперыі ў выніку падзелаў Рэчы Паспалітай, а таксама Літвы і Украіны, але Мінск вылучаўся на іх фоне, таму як «найбольшы размах выраб фальшывых дакументаў набыў менавіта ў Мінску» і «ў Мінскім дваранскім дэпутацкім сходзе знаходзілася вельмі шмат падробленых дакументаў… бо амаль няма чыноўніка, які б у гэтым мала альбо шмат не ўдзельнічаў»[15]. Адным з падробшчыкаў падобных фальшывых дакументаў з'яўляўся нават вядомы беларускі пісьменнік Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч, які ў 30-я гг. XIX ст. працаваў у натарыяльнай канторы Ю. Бараноўскага. Аднак найбольшага поспеху дасягнуў на гэтай ніве сакратар Мінскага ДДС Міхал Гаўсман, які зарабіў «на падобным рамястве фальварак, прыгожы каменны будынак на адной з вуліц [Мінска. — *В. М.*]… і, нарэшце, судовы працэс, на якім выкруціўся…»[16].

Часцей за ўсё сустракаюцца фальшыўкі ў выглядзе копій, нібыта выдадзеных з актавых кніг знішчаных комплексаў дакументаў. І хаця падобных комплексаў было дастаткова шмат, у Мінскі ДДС часцей за ўсё падаваліся фальшыўкі, як быццам выдадзеныя з наступных:

---

[13] Пра каштоўнасць і ўнікальнасць фонду Мінскага ДДС гл.: Рыбчонак С. Крыніцы па генеалогіі беларускай шляхты і правядзенне архіўных даследаванняў // Гербоўнік беларускай шляхты. — Т. 1. — Мінск: БелНДІДАС, 2002. — С. 29.

[14] Рыбчонак С. Крыніцы па генеалогіі беларускай шляхты… — С. 25–27; Яго ж. Прадмова // Гербоўнік беларускай шляхты. — Т. 2. — Мінск: НАРБ, 2007. — С. 4–5.

[15] Макаревич В. «Антиразбор» шляхты… — С. 31.

[16] Там жа. — С. 31–33.

1) матэрыялы Галоўнага Трыбунала ВКЛ Мінскай кадэнцыі за 1641–1760 гг.; комплекс (кнігі вячыстых спраў за 1641–1759 гг. і кнігі паточных спраў за 1660–1761 гг.) згарэў падчас пажару ў 1762 г.; у Мінскім ДДС дакументы, нібыта актыкаваныя ў комплексе, з'яўляюцца ў 1810-х гг. і масава падаюцца ў 20–50-я гг. XIX ст.;

2) кнігі Ашмянскіх земскага і гродскага судоў за перыяд да 1837 г.; вялікая частка матэрыялаў згарэла падчас пажару ў Ашмянах 6 жніўня 1837 г.; у Мінскім ДДС дакументы, нібыта актыкаваныя ў судах, з'яўляюцца практычна адразу пасля пажару і масава падаюцца шляхтай у 40–50-я гг.;

3) матэрыялы Навагрудскага земскага суда; вялікая частка комплексу згарэла ў Навагрудку падчас пажару ў 1765 г.; дакументы, выдадзеныя нібыта з яго, у асноўным падаваліся ў Мінскі ДДС у 20–50-я гг.;

4) кнігі Браслаўскіх земскага і гродскага судоў; большая частка комплексу была знішчана пажарам у Браславе падчас вайны 1812 г.; дакументы са спасылкай на актыкацыю ў судах падаюцца ў Мінскі ДДС шляхтай, якая паходзіла пераважна з паўночных частак Мінскай губерні — Дзісенскага і Вілейскага паветаў;

5) актавыя кнігі Полацкага земскага суда; вялікая частка комплексу была знішчана падчас пажару ў Полацку ў 1837 г.; падача дакументаў, як быццам актыкаваных у судзе, характэрная пераважна для шляхты, якая паходзіла з Паўночнай Беларусі, у тым ліку той, што ў XIX ст. пражывала на тэрыторыі Віцебскай губерні;

6) кнігі Аршанскага правінцыйнага суда, якія таксама часткова згарэлі; падача дакументаў як быццам з суда характэрная пераважна для шляхты з Усходняй Беларусі, якая ў XIX ст. пражывала пераважна на тэрыторыі Магілёўскай і Віцебскай губерняў.

Азначанымі комплексамі пералік не абмяжоўваецца, але менавіта на іх часцей за ўсё спасылалася шляхта Мінскай губерні, падаючы фальшыўкі. Тут жа трэба згадаць і матэрыялы Мінскіх земскага і гродскага судоў і Мінскага магістрата, якія хаця і не былі знішчаны, аднак у якія мінскімі чыноўнікамі, што займаліся іх захоўваннем, сшываннем ці выдачай з іх копій, у першай палове XIX ст. была ўведзена вялікая колькасць фальшывых дакументаў[17].

У сувязі з гэтым крытычны падыход пры аналізе дакументаў спраў аб дваранскім паходжанні таго ці іншага роду, асабліва той іх часткі, якая мае звычайна назву «Дакументы роду»[18], з'яўляецца абавязковым. Адсутнасць

[17] Рыбчонак С. Крыніцы па генеалогіі беларускай шляхты… — С. 26.

[18] Частка справы аб дваранскім паходжанні пад назвай «Дакументы роду» ўяўляе сабой збор доказаў шляхецтва — арыгіналы і копіі дакументаў аб набыцці, перадачы

падобнага крытычнага стаўлення прыводзіць да ўвядзення ў навуковы ўжытак памылковых звестак, узятых са сфальсіфікаваных дакументаў[19].

* * *

Асобную групу сярод шляхецкіх родаў беларускіх зямель складаюць роды духоўнага паходжання. Перш за ўсё гэта адносіцца да святарскіх родаў дзвюх «усходніх» канфесій — праваслаўнай і ўніяцкай (грэка-каталіцкай). У рымска-каталіцкай царкве з-за абавязковага для белага кліру абету цэлібату ўмоў для складання святарскіх дынастый не існавала апрыёры. Таму нават калі сярод прадстаўнікоў пэўнага роду некаторыя асобы і з'яўляліся рымска-каталіцкімі святарамі, аднесці яго да катэгорыі «роду духоўнага паходжання» не выпадае (хаця сярод ксяндзоў абсалютная большасць з'яўлялася выхадцамі менавіта са шляхты).

Колькасныя суадносіны праваслаўных і ўніяцкіх святарскіх родаў сярод беларускай шляхты таксама нераўнамерныя. Праваслаўных непараўнальна менш, асабліва калі, як у выпадку з дадзеным выданнем, абмежаваць разглядаемы арэал тэрыторыяй Мінскай губерні. Сярод спраў Мінскага ДДС можна назваць толькі адзінкавыя: Біруковічы, Плышэўскія, Юхневічы, Яхімовічы — бадай усё. Пасля 1839 г., калі ўсе структуры і інстытуты ўніяцкай царквы ў т.зв. «заходніх губернях» былі перададзены ў праваслаўнае ведамства, падзел святарскіх родаў на праваслаўныя і ўніяцкія дэ-юрэ знік. Аднак яшчэ да 60-х гг. XIX ст. у афіцыйным справаводстве захоўваўся падзел святароў на «древлеправославных» і «воссоединенных».

У трэцім томе «Гербоўніка беларускай шляхты» і ў двух папярэдніх уніяцкія святарскія роды прадстаўлены дастаткова шырока. Гэта роды Акаловічаў, Акаронкаў, Андраеўскіх (Андржэеўскіх), Арашкевічаў (Аржашкевічаў), Ачапоўскіх, Бараноўскіх, Беліновічаў, Бельдзяшэўскіх, Будзіловічаў, Буцэвічаў, Вайлевічаў, Васілеўскіх, Васінскіх, Вернікоўскіх, Вішнеўскіх, Вырыкоўскіх і Вярыгаў (Вярыгаў-Дарэўскіх). Да гэтага шэрагу не адносяцца тыя

---

і продажы зямельнай маёмасці, аб атрыманні прывілеяў на займанне дзяржаўных, грамадзянскіх і вайсковых пасад альбо атрыманні грамадзянскіх і вайсковых чыноў, выпісы з метрычных кніг, рэвізскіх сказак, пасведчанні павятовых маршалкаў, казённых палат, грамадзянскіх і вайсковых губернатараў, ваенна-павятовых начальнікаў і да т.п.

[19] Для прыкладу гл.: Ліпскі У. Я. Праўдзівы аповяд пра твой і мой радавод. — Мінск: Беларусь, 1998. — 318 с.; Залівака А. С. Фасцыкул І. Радаводы шляхецкіх сем'яў ВКЛ на літару «В»: артыкулы. — Мінск: Энцыклапедыкс, 2011. — 123 с.; і інш. На жаль, не пазбаўлены гэтых хібаў і першыя два тамы «Гербоўніка».

роды, у якіх толькі адзін ці некалькі прадстаўнікоў абралі для сябе святарскую кар'еру і не стварылі дынастыі (напрыклад, Буцвілоўскія).

Варта адзначыць, што ў Рэчы Паспалітай, у адрозненне ад Расійскай імперыі, не існавала асобнага духоўнага саслоўя. Між тым у XVIII ст. больш за 82 % уніяцкіх святароў належалі да спадчынных святарскіх родаў[20]. Менавіта таму большасць з іх да 60-х гг. XIX ст. не атрымала зацвярджэння ў правах расійскага дваранства, а была пераведзена ў духоўнае саслоўе. Выключэнне склалі толькі тыя роды, сярод прадстаўнікоў якіх было шмат свецкіх шляхціцаў, што валодалі нерухомай маёмасцю альбо знаходзіліся на дзяржаўнай службе (Беліновічы, Вернікоўскія і інш.).

Асаблівасцю беларускіх зямель быў істотны працэнт шляхты сярод прадстаўнікоў праваслаўнага і ўніяцкага кліру. Прывядзём прыклад для параўнання. Паводле звестак польскага даследчыка В. Бобрыка, у сярэдзіне XVIII ст. сярод 127 новавысвечаных святароў Холмскай уніяцкай епархіі (Каралеўства Польскае) да шляхецкіх родаў належала ўсяго 4 чалавекі[21]. У той жа час Кіеўска-Віленская і Полацкая епархіі (цэнтральна- і ўсходнебеларускія землі) мелі значна большую колькасць святароў шляхецкага паходжання. Польскі гісторык С. Набыванец прыводзіць прыклад Браслаўскага і Чарэйскага дэканатаў, дзе з агульнай колькасці святароў — 41, 14 паходзілі са шляхты, а яшчэ 5 — са змяшаных святарска-шляхецкіх родаў[22]. Паводле нашых падлікаў, у XVIII – пачатку XIX ст. каля 16,5 % уніяцкіх святароў беларуска-літоўскіх зямель мелі шляхецкае паходжанне[23].

У артыкулах трэцяга тома «Гербоўніка», прысвечаных родам духоўнага паходжання, сустракаюцца тэрміны, якія адлюстроўваюць займанне прадстаўнікамі разнастайных духоўных пасад. Для таго каб атрымаць пасаду святара пры пэўнай царкве, неабходна было атрымаць *прэзенту* — пісьмовы дазвол уласніка зямлі, на якой размяшчалася парафія, на святарскую вакансію. Працэс атрымання прэзенты называўся *прэзентацыяй*. Права землеўласнікаў абіраць прэтэндэнтаў на святарскія пасады ў цэрквах у сваіх землях

---

[20] Лісейчыкаў Дз. Штодзённае жыццё ўніяцкага парафіяльнага святара беларуска-літоўскіх зямель 1720–1839 гг. — Мінск: Медысонт, 2011. — С. 33.

[21] Bobryk W. Duchowieństwo unickiej diecezji chełmskiej w XVIII wieku. — Studia i materiały do dziejów chrześcijaństwa wschodniego w Rzeczypospolitej. — T. 2. — Lublin: Instytut Europy Środkowo-Wschodniej, 2005. — S. 47.

[22] Nabywaniec S. Unicka archidiecezja kijowska w okresie rządów arcybiskupa metropolity Felicjana Filipa Wołodkowicza 1762–1778. — Rzeszów: Poligrafia Wyższego Seminarium Duchownego w Rzeszowie, 1998. — S. 377.

[23] Лісейчыкаў Дз. Штодзённае жыццё … — С. 38.

называлася лацінскім тэрмінам *jus collationis* (дaслоўна — права ўнёску), альбо права *collatio*. Юрыдычна яно было замацавана пастановай Вальнага сойму Рэчы Паспалітай у 1647 г.[24], а адменена толькі ў 1833 г. Затым прэтэндэнт павінен быў атрымаць ад епіскапа высвячэнне і *інсталяцыю* (альбо т.зв. *стаўленую грамату*) — пісьмовы дазвол епіскапа на займанне святарскай пасады пры пэўнай царкве.

Малая даследчанасць у законах Расійскай імперыі прыводзіла да таго, што святары часта ў якасці доказу шляхецкага паходжання прадстаўлялі стаўленыя граматы сваіх продкаў XVIII ст. Аднак згодна са Зборам законаў Расійскай імперыі такі від дакументаў з'яўляўся доказам прыналежнасці да духоўнага саслоўя[25]. У справах таксама часта сустракаюцца і арыгіналы прэзентаў. Мелі месца і супрацьлеглыя крайнасці. Некаторыя святарскія роды пры доказах свайго шляхецкага паходжання ўвогуле не згадвалі святарскія карані. У якасці прыкладу можна прывесці род Вайлевічаў з-пад Барысава. Яны свядома не згадвалі пра займанне сваімі продкамі духоўных пасад, нават не падавалі ў вывадзе імя Сільвестра Вайлевіча (Войлева), які з'яўляўся святаром яшчэ ў другой палове XVII ст. У якасці родапачынальніка быў пазначаны яго сын Ян, аб займанні святарскай пасады якім у вывадзе таксама не гаворыцца ніводнага слова. Святарскі род Вярыгаў выводзіў свае карані ад роду Вярыгаў-Дарэўскіх, якім у XVI–XVII стст. належаў маёнтак Дарава Навагрудскага павета. Аднак дакументы фонду Мінскай праваслаўнай духоўнай кансісторыі сведчаць, што і ў XVII ст. прадстаўнікі роду Вярыгаў займалі пасады святароў пры ўніяцкіх цэрквах Мінскага павета і ніякага дачынення да маёнтка Дарава не мелі.

Увогуле, матэрыялы Мінскага ДДС сведчаць, што чыста святарскія дынастыі ўрэшце рэшт правоў расійскага дваранства не дамагліся[26].

* * *

З 2007 г. у Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі працягвалася распрацоўка планавай навуковай тэмы «Генеалогія і геральдыка шляхецкіх

[24] Volumina Legum. — Tom IV. — Petersburg: Nakładem i drukiem Jozafata Ohryzki, 1860. — S. 59.

[25] Свод законов Российской империи, издания 1857 года. — Т. 9. — Законы о состояниях. — СПб.: Типография Второго отделения собственной Его Императорского Величества Канцелярии, 1857. — С. 57. (Раздел II, статья 247).

[26] Падрабязней аб святарскіх родах шляхецкага паходжання на беларускіх землях гл. названыя працы В. Бобрыка, Дз. Лісейчыкава, С. Набыванца.

родаў Беларусі», якая прывяла ў 2012 г. да падрыхтоўкі трэцяга тома «Гербоўніка». Ён ахоплівае шляхту пераважна Мінскай губерні на літару «В» і змяшчае 249 артыкулаў. У яго ўключаны і тыя роды, што маюць падвойнае прозвішча, асноўная частка якога пачынаецца на літару «В» — Брудна-Валентыновічы, Падчашуі-Варановічы,Ваўкі-Ланеўскія, Вярэнічы-Стахоўскія і інш. Пры гэтым абавязкова пазначаліся і прыдомкі, якія ўтварыліся, як правіла, ад назвы герба, месца пражывання ці паходжання роду альбо іншым чынам склаліся ў працэсе працяглага фарміравання шляхецкага саслоўя. З гэтай жа прычыны ў том не трапілі некаторыя роды, якія ўнесены ў вопісы фонду Мінскага ДДС альбо ў складзеныя напачатку XX ст. яго алфавітныя рэестры пад літарай «В», аднак адпаведныя часткі прозвішча ў якіх з'яўляюцца толькі прыдомкамі — Варня-Ракі, Караневічы-Высоцкія, Дваранінавічы-Высоцкія і інш.

Артыкулы напісаны паводле схемы, уведзенай у папярэдніх тамах, і складаюцца з 5 частак:

1) прозвішча роду, магчымы прыдомак, герб;

2) звесткі пра легенды аб паходжанні роду альбо найбольш старажытных вядомых прадстаўнікоў;

3) пакаленны роспіс, створаны на падставе матэрыялаў, пададзеных у Мінскі ДДС;

4) звесткі пра зацвярджэнне ці незацвярджэнне роду ў расійскім дваранстве ўказамі Сената;

5) крыніцы, на падставе якіх напісаны артыкул.

Асновай для падрыхтоўкі гэтага тома, як і папярэдніх, з'ўляліся матэрыялы Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу (ф. 319, воп. 1 і 2), найбольш каштоўную частку якіх складаюць справы аб паходжанні таго ці іншага роду, яго прызнанні і зацвярджэнні (альбо незацвярджэнні) у дваранстве. Аднак пры падрыхтоўцы артыкулаў маглі выкарыстоўвацца і іншыя матэрыялы (архіўныя ці апублікаваныя), калі яны былі вядомы аўтару на час напісання артыкула. Як і ў папярэдніх тамах, пры складанні артыкулаў вялікая ўвага надавалася валоданню шляхтай зямельнай маёмасцю і займанню дзяржаўных пасад. Аднак пры ўкладанні тома аўтары ўлічылі папярэдні досвед і звярнулі значна большую ўвагу на насычэнне артыкулаў фактычнымі звесткамі — месцы і час пражывання асобных шляхціцаў (у першую чаргу на працягу канца XVIII–XIX ст.), іх удзел у грамадска-палітычных падзеях (войнах, паўстаннях і інш.), змяненне сацыяльнага становішча (пераход са святарскага стану ў дваранскае саслоўе, залічэнне ў якое-небудзь падатковае саслоўе і да т.п.), прафесійныя заняткі (прыватная ці дзяржаўная (грамадзянская альбо вайсковая) служба) і іншыя падрабязнасці, якія маюцца ў матэрыялах фонду Мінскага ДДС. Усе падобныя "дробязі" могуць паслужыць добрымі адпраў-

нымі пунктамі пры правядзенні ў далейшым больш грунтоўных генеалагічных даследаванняў.

Неабходна згадаць яшчэ пра адну спецыфіку матэрыялаў Мінскага ДДС. У сувязі з тым, што ўвесь працэс пераводу шляхты Рэчы Паспалітай у розныя саслоўі Расійскай імперыі адбываўся ў апошняй трэці XVIII–XIX стст., то і названы фонд ўтрымлівае звесткі ў першую чаргу менавіта пра шляхецкую генеалогію адпаведнага перыяду. Звесткі пра перыяд да сярэдзіны XVIII ст. і тым больш XVII ст. альбо больш ранняга часу значна саступаюць па сваім аб'ёме і пададзены, як правіла, у выглядзе легенды ці папросту сфальсіфікаваны. Варта таксама сказаць, што матэрыялы фонду Мінскага ДДС не з'яўляюцца поўным зборам дакументаў па гісторыі пэўнага роду нават пры наяўнасці яго персанальнай справы. Часта звесткі проста фрагментарныя і ўрыўкавыя, і гэта моцна ўплывае на аб'ём розных уключаных у «Гербоўнік» артыкулаў. Пра асобныя роды вядомы толькі вывадовыя пратаколы, дзе могуць адсутнічаць спасылкі і згадкі пра дакументы, на падставе якіх адбывалася прызнанне ў дваранстве. Гэта не дазваляе правесці грунтоўную крытыку ўключаных у артыкулы звестак і прымушае падаваць шмат якія як апрыёры сапраўдныя.

Трэці том, як і папярэднія два, забяспечаны паказальнікамі імёнаў і геаграфічных назваў. Да яго дадаюцца таксама каляровыя выявы гербаў шляхецкіх родаў, якія маюцца ў матэрыялах фонду — у справах аб паходжанні асобных родаў, генеалагічных табліцах і кнігах вывадовых пратаколаў. Паколькі дзякуючы сучасным інфармацыйным тэхналогіям выявы гербаў сталі лёгкадаступнымі для даследчыкаў, у том уключаны толькі тыя выявы, якія змешчаны ў дакументах самімі прадстаўнікамі роду, нават калі малюнкі былі выкананы на самым прымітыўным узроўні.

У томе, як і ў папярэдніх двух, пазначэнне адміністрацыйна-тэрытарыльнай прыналежнасці населеных пунктаў здзейснена наступным чынам. У выпадку, калі звесткі тычацца перыяду Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай, пазначаецца толькі павет альбо ваяводства (напрыклад, Ашмянскі пав., Мінскае ваяв. і да т.п.). Калі ж звесткі адносяцца да перыяду Расійскай імперыі, указваюцца як павет, так і губерня (напрыклад, Ашмянскі пав. Віленскай губ., Мінскі пав. Мінскай губ. і да т.п.).

Аўтарскі калектыў выказвае шчырую падзяку ўсім, хто дапамагаў пры напісанні гэтай кнігі: дырэктару Дэпартамента па архівах і справаводству Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь Уладзіміру Іванавічу Адамушку і дырэктару Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі Дзмітрыю Уладзіміравічу Яцэвічу за арганізацыйную дапамогу ў выданні, а таксама Зінаідзе Васільеўне Антановіч і Ігару Аляксандравічу Гавіну за дапамогу ў падрыхтоўцы да публікацыі гербавых выяў, Юрыю Мікалаевічу

Снапкоўскаму за кансультацыі пры складанні навукова-даведачнага апарату, Зміцеру Лявонцьевічу Яцкевічу за выказаныя заўвагі, а таксама ўсім супрацоўнікам НГАБ, што мелі дачыненне да падрыхтоўкі дадзенага тома.

Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі працягвае працу па складанні чарговых тамоў «Гербоўніка беларускай шляхты». Наступным рыхтуецца том, куды будуць уключаны больш за 250 артыкулаў з радаводнымі росписамі шляхты зноў пераважна Мінскай губерні, чые прозвішчы пачынаюцца на літару «Г».

*Дз. Лісейчыкаў, Дз. Матвейчык*

Кастрычнік 2012 г.

## СПІС СКАРАЧЭННЯЎ

| | | | |
|---|---|---|---|
| адв. | адварот | кн. | князь, князёўна, княгіня |
| арк. | аркуш | літ. | літоўскі |
| арт. | артыкул | маёнт. | маёнтак |
| аўстр. | аўстрыйскі | мал. | малюнак |
| в. | вёска | муж. | мужчынскі |
| вак. | ваколіца | мяст. | мястэчка |
| ваяв. | ваяводства | нар. | народжаная |
| ВКЛ | Вялікае Княства Літоўскае | пав. | павет |
| | | пал. | палова |
| вобл. | вобласць | пол. | польскі |
| вол. | воласць | прус. | прускі |
| воп. | вопіс | р. | рака |
| вул. | вуліца | рас. | расійскі |
| вял. | вялікі | руб. | рубель |
| г. | год | с. | сяло |
| гг. | гады | Св. | Святы(ая) |
| гл. | глядзі | СПб. | Санкт-Пецярбург |
| гор. | горад | спр. | справа |
| ГТ | Галоўны Трыбунал | ст. | 1) станцыя; 2) ступень; 3) стагоддзе |
| гр. | граф | | |
| губ. | губерня | | |
| ДДС | дваранскі дэпутацкі сход | стст. | стагоддзі |
| | | тыс. | тысяча |
| дзес. | дзесяціна | уроч. | урочышча |
| жан. | жаночы | у т.л. | у тым ліку |
| засц. | засценак | ф. | фонд |
| зл. | злоты | фальв. | фальварак |
| іл. | ілюстрацыя | хр. | хрышчаны, -а |
| інш. | іншыя | хут. | хутар |
| кап. | капейка | чыг. | чыгуначны |

## УМОЎНЫЯ АБАЗНАЧЭННІ

| | | | |
|---|---|---|---|
| N. | невядомае імя | * | нарадзіўся, -лась |
| v. | (voto) тут: у шлюбе | † | памёр, -мерла |

# АСАБОВЫ ПАКАЗАЛЬНІК


Абалонская, нар. Вольская, Багуміла 140
Абламовіч Адэлаіда-Лілія Дамінікаўна, v. Вірпша 160
Абламовіч Алена, v. Ванькові 66
Абламовіч, памешчык 173
Аборская N., v. Воўк-Ланеўская 111
Аборскі Гіляры, падкаморы мінскі 86, 175
Аборскі Тамаш, мінскі павятовы маршалак 125, 175
Абрагімовіч Алена, v. Война 188
Абрамовіч Апалонія, v. Ваяводская 125
Абрамовіч Кацярына, v. Воўк-Ланеўская 111
Абрамовіч Мікалай 221
Абрамовіч Тэрэза 162
Абрамовіч N. 196
Абрампальскі Антоні Пятровіч, суддзя Дзісенскага межавага суда 18
Абрампальскі, маршалак 161
Абрампальскі Тадэвуш 83
Абуховіч Ізабэла, v. Ваньковіч 66
Абуховіч Міхал, кашталян мінскі 139
Абуховіч Філіп 35
Абуховіч, памешчык 70
Абуховіч Юзафіна, v. Вольская 199
Абуховіч N. 197
Абуховіч N., v. Вайніловіч 12
Агінская Апалонія, v. Вышамірская 217
Агінскі Міхал-Казімір, кн., гетман вялікі літ. 120
Агінскі Міхал-Клеафас, кн., падскарбі літ. 78
Агінскі Тадэвуш, кашталян троцкі 108
Агінскі Францішак, кн. 108
Агінскі N., кашталян 6
Агінскі N., кн. 31
Агрыпа Цэцылія, v. Вансовіч 63
Адамовіч Агата, v. Высоцкая 210
Адамовіч Войцех 216
Адамовіч Іаанна 74
Адамовіч Марыяна, v. Варановіч 75
Адамовіч Тэадора, v. Вайніловіч 11
Адамовіч Францішка, 1 v. Вышынская, 2 v. Яноўская 220
Адахоўская Кацярына, v. Вайніловіч 11
Адляніцкая-Пачобут Соф’я Дамінікаўна, гл. Пачобут-Адляніцкая Соф’я Дамінікаўна
Адорская Агнешка, v. Валянская 58
Адуцкевіч Антаніна Юр’еўна, v. Васілеўская 98
Адынец, нар. Валіцкая, Алена 39
Адынец Ганна, v. Вайшкевіч Высоцкая 216
Адынец Марыя 9
Адынец Тэафіла, v. Вайніловіч 9
Адынец Юлія, v. Вярбіцкая 237
Адэльскі Ян-Адрыян, прэпазіт цімкавіцкі 9
Ажароўская N., v. Воўк-Ланеўская 110
Ажэшка Адам, падкаморнік Кобрынскага пав. 120
Ажэшка Людвік, падкаморнік Пінскага пав. 120
Ажэшкі 12
Азевіч Вікторыя, v. Вярцінская 242

Азямблоўская Аляксандра Станіславаўна, v. Вернікоўская 133
Азямблоўская Брыгіда, v. Вілямоўская 152
Айцяшковіч Вікторыя, v. Вагнэр 3
Акаловіч Антаніна, v. Віткоўская 167
Акаловіч Соф’я, v. Валаховіч 36
Акаловіч Францішка, v. Вярбіцкая 237
Акаловіч Юстына, v. Варакса 69
Акенчыц Анеля, v. Вяленчыц 227
Акуліч Альжбета, v. Ваяводская 125
Акуліч Крысціна Якаўлеўна, v. Вярбіцкая 237
Акуліч, нар. Вансовіч, Тэрэза 63
Акунь Яніна, v. дэ Вабэ 1
Акушка Фрузына, v. Вірпша 160
Акушка Юзаф, суддзя межавы 184
Александровіч, нар. Валіцкая, Марыяна 39
Александровіч Станіслава, v. Ванькові 66
Александровіч Фаціма, v. Варановіч 75
Александровіч N., пісар земскі полацкі 39
Алелькавіч Юрый Сямёнавіч, кн. 137
Алелькі-Лямніцкія (Лямніцкія-Алелькі) 115
Алендская Магдалена, v. Вайніловіч 10
Алендская, памешчыца 237
Аленская, нар. Ваўчок, Алена 115
Алендскі Рыгор, надворны радца 80
Алізар Філіп Ануфрыевіч, гр. 35
Алізар N., гр. 231
Алізар N., падчашы літ. 149
Альпінская, нар. Жамбоцкая, Ганна 245
Альпінская-Зяновіч Тэрэза, гл. Зяновіч-Альпінская Тэрэза
Альпінскі Мікалай 245
Альшэўская Людвіка, v. Войжбун 183
Алявінская N., памешчыца Ігуменскага пав. 80
Аляксандр II, імператар рас. 150
Аляксандр III 178
Аляксевіч Аўдоцця, v. Віткоўская 167
Алясевіч Кацярына, v. Вайніловіч 11
Амбрашкевіч Аляксандра, v. Вярбоўская 238
Аміч Люцыя, v. Варакса 69
Андраеўская Антаніна, v. Вярыга 243
Андраеўская Соф’я, v. Вярбіцкая 237
Андрусеўская Ружа, v. Варакса 69
Андруховіч Агата Андрэеўна, v. Валатоўская 35
Андрушкевіч Антоні 235
Андрушкевіч, нар. Вярбіцкая, Кацярына 235
Андрушкевіч Францішка, v. Вольская-Мякчыловіч 200
Андэрс Уладзіслаў, генерал, камандуючы 2-м Польскім корпусам 66
Аніщчык Лізавета, 1 v. Баятылева, 2 v. Валіцкая 39
Анкудовіч Разалія, v. Войніч 184
Аношка Апалінарыя, v. Варакса 71
Аношка Барбара, v. Вайноўская 15

Аношка Ганна, v. Ванькевіч 65
Аношка Кацярына, v. Войніч 184
Аношка Марыяна, v. Варакса 71
Аношка N. 215
Ансілеўскі Юзаф 49
Антановіч Анеля, v. Валіцкая 39
Антановіч N., v. Валіцкая 39
Анцута Францішка, v. Верашчака 132
Анцыпяровіч Марыяна, v. Віткоўская 166
Апока Казімір 185
Апока Мікалай 185
Апока Пётр 185
Апока Ян 185
Арамовіч N. 98
Ардынская Марыя, v. Вашклевіч 123
Арлоўская Кацярына Юзафаўна, v. Віславух 162
Арцімовіч Ядвіга, v. Віткоўская 167
Арцімовіч N., v. Вангіна 59
Арцішэўская, нар. Ваўчок, Барбара 115
Арцішэўская Францішка, v. Вяленчыц 227
Арцішэўскі Францішак 115
Арэшка Ганарата, v. Вольская 197
Аскерка Ігнат, падстараста Рэчыцкага павятовага суда 88
Аскерка Марцін-Тэадор, маршалак ашмянскі 8
Аскерка Петрунэля, v. Вольбэк 192
Аскеркі, кашталяны 109
Астановіч Людвіка Барталамееўна, 1 v. Валовіч, 2 v. Квяткоўская 46
Астравіцкія 48
Астравух, нар. Ваўчок, Петрунэля 115
Астравух Тамаш-Антоні 115
Астроўка Эстэр, v. Васілеўская 84
Астроўская Вінцэнта, v. Варанковіч 72
Астроўская Марыяна, v. Вярсоцкая 240
Астроўская Францішка, v. Вяленчыц 227
Астроўскі Якуб 99
Астрэйка Алена, v. Войніч 185
Астрэйка Аляксандра, v. Вярбіцкая 237
Астрэйка Марыяна, v. Вярбіцкая 235
Астрэйка Элеанора, v. Войніч 185
Асяцімская Кацярына Банавентураўна, v. Валовіч 46
Асяцімская N., v. Валіцкая 39
Атрашкевіч Марыя (Марыяна) Мікалаеўна, v. Віткоўская 167
Аўгуст II, кароль пол. і вял. кн. літ. 47, 109, 141, 154, 204
Аўгуст III, кароль пол. і вял. кн. літ. 6, 46, 47, 48, 64, 66, 81, 141
Аўлачымская Бянігда, v. Вальчэўская 55
Аўлачымская Ганна, v. Ваўчок 115
Ахматовіч N., падпалкоўнік пярэдняй варты войскаў літ. 188
Ахрамовіч Анеля, v. Варакса 70
Ашторп Леан, сапраўдны стацкі радца, ігуменскі маршалак, затым мінскі губернскі маршалак 4, 175

Бабровіч Барбара Якубаўна, v. Вольская 198
Бабровіч Францішка, v. Вярбіцкая 236
Баброўская Вікторыя, v. Войніч 184
Баброўская Зузана, v. Войніч 184

Баброўская Тэадора, v. Віткоўская 167
Баброўская N., v. Вірпша 160
Багатка Марыя, v. Віткоўская 167
Баграновіч Алена, v. Вазгінт 5
Баграновіч Гальяш, ротмістр войскаў пол. 94
Баграновіч Ганна, v.Ваўчэцкая 117
Баграновіч Ганна, v. Высоцкая 213
Баграновіч Людвіка, лоўчына мінская 125, 195, 198
Баграновіч Пляцыда, v. Вярбіцкая, 236
Баграновіч Пляцыда, v. Вярбоўская 238
Баграновіч Раіна, v. Варановіч 75
Багданоўская Марыяна, v. Вырыкоўская 206
Багдашэўскі Антоні, дэпутат Мінскага ДДС 32
Багінская Вікторыя, v. Віславух 162
Багінская Тэкля Станіславаўна, v. Вярыга 244
Баграціён, княгіня 133
Багрыцэвіч Аляксандра, v. Вянглінская 230
Багрыцэвіч Юзэфа, v. Вернікоўская 133
Багуслаўскі, землямер 215
Багуцкая Бянігда, v. Вагнэр 2
Багуцкая Петрунэля, 3 v. Вешанеўская 138
Багушэвіч Станіслаў 122
Багушэвіч Стэфан, каморнік навагрудскі 9
Багушэвіч N., капітан войскаў пол. 39, 42
Багушэўская Алена-Адэля Вераніка, v. Ваньковіч 66
Бажэнка, нар. Вішнеўская, Марыя 179
Бажэнка, капітан, камандзір Пултускай інваліднай каманды 179
Бажэўская Марцыяна (Тэрэза), v. Корвін-Вышкоўская 219
